***В. У. Міронава** (УА «ГДУ імя Ф. Скарыны»)*
*Навук. кір. **А. М. Мельнікава**,*
*к.ф.н., дацэнт*

## ПОШУКІ ВІКТАРА ЖЫБУЛЯ Ў ГАЛІНЕ ФОРМЫ

На пачатку творчасці В. Жыбуль шмат увагі надаваў форме сваіх вершаў. Выбітнай старонкай яго творчай біяграфіі можна назваць паліндромныя вершы. В. Жыбуль – аўтар не толькі паліндромных вершаў, але і першых у беларускай паэзіі паэм-паліндромаў і нават паліндромнага апавядання пад назвай «Хам у думах». У паэмах такога кшталту, нягледзячы на немагчымасць уцямнай перадачы зместу, выразна прасочваюцца пафас, агульная ідэя. Гэта сведчыць пра надзвычайную чуйнасць аўтара да сродкаў мовы, іх магчымасцей.

Назіраецца ў ранняй творчасці і захапленне візуальнай паэзіяй, напрыклад, верш «Трансфіліпунцыя». Гэты твор мы потым сустрэнем у зборніку «Дыяфрагма», а таксама іншыя вершы-фігуры («Горны тэхнапейзаж», «Плюмбікон», «Літры літар», «Я і час»). Уся візуальная паэзія В. Жыбуля – дадатковае фармальнае выражэнне зместу твораў, якое пашырае і паглыбляе прастору іх успрымання.

Актыўна выкарыстоўваюцца ў ранняй творчасці і вершах зборніка «Дыяфрагма» алітэрацыя і адсутнасць знакаў прыпынку. Адсутнасць знакаў прыпынку не толькі адсылае нас да літаратуры «плыні свядомасці» (як, напрыклад, вершы-медытацыі: «Медытацыя ўяўлення», «Медытацыя вольнасці», «Медытацыя імкнення»). Гэта і своеасаблівы пасыл аўтара на непатрэбнасць знакаў прыпынку ў дадзеным канкрэтным творы: чытач успрымае ў якасці адзінак тэксту фразы, якія аўтар падае асобнымі радкамі. Яны самім сваім сэнсам уздзейнічаюць на рэцыпіента. Аднак у зборніку набірае моц класічны рыфмаваны радок, чаго не было раней.

Пошукамі ў галіне формы вылучаецца і зборнік «Забі ў сабе Сакрата!». Большая частка твораў мае невялікі памер (у асноўным двух- і чатырохрадкоўі), яны адпавядаюць эстэтыцы абсурду. Прысутнічаюць у зборніку і такія формы, як туюг, манаверш, а ў сааўтарскі Веры Бурлак – і трыялет-брахікалан. У вершах зборніка, такім чынам, знітаваных абсурдным зместам, назіраецца працяг эксперыментаў з формай, але ўжо іншага кшталту, чым у папярэдні перыяд творчасці.

Гэта апошні на сённяшні дзень зборнік паэта. Далей былі толькі вершы з так і не выдадзенай пакуль што кнігі «Стапеліі». У гэтых творах знікаюць не толькі знакі прыпынку, але і рыфма, пераважае верлібр. У некаторых жа творах наглядаецца вяртанне да класічных зместавa-фармальных традыцый («На правай маёй далоні...»). Увогуле, фармальныя пошукі тут сыходзяць на другі план, саступаючы месца ідэйна-тэматычным.

***А. С. Мхаян** (УА «ГДУ імя Ф. Скарыны»)*
*Навук. кір. **А. В. Брадзіхіна**,*
*к.ф.н., дацэнт*

## КАНЦЭПТ *ШЛЯХУ* Ў ТВОРЧАСЦІ А. РАЗАНАВА

Канцэпт – гэта складаны комплекс сэнсаў вобраза, які ўзнікае ў паэта пры спалучэнні ўласнага, нацыянальнага і сусветнага вопыту. Да гэтага дадаецца яшчэ вопыт чытача. Рэалізацыя канцэпту *Шляху* ў лірыцы А. Разанава адбываецца па наступных мадэлях: шлях па крузе, шлях у нікуды, шлях вяртання, шлях углыб, шлях у бясконцасць.

Атаясамліванне жыццёвага шляху з кругам належыць да класічных уяўленняў. А. Разанаў развівае гэтую ідэю, і ў выніку прыходзіць да глыбокай высновы, што галоўнае ў шляху па крузе – не спыняць рух, г.зн. само існаванне, якое і з’яўляецца мэтай

(пункціры «Усё мінае, – сказаў мудрэц…», «Той крок…», версэты «У крузе», «Палёт стралы» і інш.)

У памежнай сітуацыі лірычны герой А. Разанава часта губляецца ў часе і прасторы, але не спыняе пошук, нават калі даводзіцца пакінуць абраны шлях, каб выбраць новы; асэнсаваўшы, што рухаешся ў нікуды, *«бо ўсе перашкода ўсім»*, а *«на рэчаіснасці пляма»* [1, с.145], зноў вярнуцца на папярэднюю дарогу. Спосабы вырашэння праблемы бязмэтнага руху паэтам не падаюцца («Рэчаіснасць», «Плынь» і інш.).

Шлях вяртання ў А. Разанава рэалізуецца пераважна праз матыў рэінкарнацыі. Так, у версэце «Мы, людзі» ўзнікае адмысловы вобраз сонцалюдзей. У асобных творах паэт выкарыстоўвае архетыповую мадэль вяртання, сцвярджаючы, што чалавек вяртаецца туды, адкуль выйшаў (вершаказ «Гліна»): *«...з гліны ўсё паўстае, і ў гліну ўсё гіне»* [1, с.3].

Акрамя таго, паэт імкнецца раскрыць, спасцігнуць самога сябе, а ўжо праз гэта сутнасць чалавека наогул. Яскрава дадзеная мадэль рэалізуецца ў зномах, версэтах «Мэта», «Гной», «Паверхня», пункцірах «Спазніўся ўстаць…», «Стаю перад кніжнай паліцай…», «Каб зразумець сябе…» і інш.

Шлях у бясконцасць, як і шлях у нікуды, прадугледжвае страту ці мадыфікацыю ў мастацкім тэксце катэгорыі часу. Чалавек не можа ні вярнуцца назад па сваіх слядах, ні спыніцца. Яму наканаваны бясконцы рух наперад, за далягляд, за небакрай (версэты «Будучыня», «Бязмежжа», пункціры «Блукаюць сны…», «Выбіўся з рытму часу…» і інш.).

Такім чынам, назіраючы за будзённымі, непрыкметнымі ў сваёй звычайнасці рэчамі, А. Разанаў стварае розныя мадэлі жыцця чалавека, межы паміж якімі дакладна не акрэслены.

ЛІТАРАТУРА

1 Разанаў, А. С. Лясная дарога : версэты [Тэкст] / А. С. Разанаў – Мн. : І. П. Логвінаў. – 2005. – 200 с.

***Р. У. Раманаў*** *(УА «ГДУ імя Ф. Скарыны»)*
*Навук. кір.* ***Т. А. Фіцнер,***
*к.ф.н., дацэнт*

## ТЭОРЫЯ ХАОСУ Ў ТВОРЧАСЦІ К. ЧОРНАГА

Як філасофская з'ява свету хаос («беспарадак, неразбярыха; бязладнае змяшчэнне чаго-небудзь» [1, с. 378]) асэнсоўваўся ў многіх галінах мастацтва. У выніку сцвердзілася новая канцэпцыя крытычнага і мастацкага мыслення, якая атрымала назву «тэорыя хаосу». Нягледзячы на постмадэрнісцкую сутнасць, даная тэорыя дазваляе разглядаць з'явы мадэрнісцкага напрамку і атрымліваць новыя каштоўныя ідэі. Гэта слушна і ў дачыненні да творчасці К.Чорнага. Так, у апавяданні «Парфір Кіяцкі» прысутнічае думка, што «бура – хаос, патрэбны для аднаўлення гармоніі…» [2, с. 337], што «з дробных часцін хаосу складзена для вечнага руху гармонія» [2, с. 338]. Як бачна, пісьменнік «звяртаецца да экзістэнцыянальнай думкі пра чалавека як істоту гарманічную, якая прагне суладнасці ў пачуццях» [3, с. 39].

Згодна з многімі рэлігіямі, першапачатковым элементам усіх з'яў было так званае «нішто». Філасофская думка першапачатковага «нішто» лічыла, што сусвет быў заўсёды, але ў ім не было неабходных умоў для існавання істоты, якую вызначала наяўнасць розуму. Таму чалавек з'явіўся на Зямлі многа пазней. І калі чалавечы розум пачаў генерыраваць свае ідэі аб перабудове свету, увасабляючы іх у жыццё, то адразу прыйшоў да высновы, што ўсё рухаецца, усё змяняецца, з Хаосмаса ператвараецца ў Космас і наадварот. У 21 ст. гэтая выснова набывае назву «тэорыя хаосу».